*Конь Пржавальскага* (мал. 196) — адзін з продкаў свойскіх коней — быў знойдзены ў канцы XIX стагоддзя ў пустынях Цэнтральнай Азіі рускім падарожнікам М. М. Пржавальскім. Афарбоўка цела жывёлы палевая або чырванавата-жоўтая, жывот і морда святлейшыя; уздоўж пазваночніка цягнецца вузкая цёмная паласа.

**Паўторым галоўнае.** Капытныя — група млекакормячых, пальцы якіх пакрыты рагавымі капытамі. Адрозніваюць парнакапытных (цотная колькасць пальцаў) і няпарнакапытных (няцотная колькасць пальцаў) жывёл. Парнакапытныя, у якіх праглынуты раслінны корм са страўніка адрыгаецца ў ротавую поласць для паўторнага пережоўвання, належаць да жвачных. У жвачных парнакапытных страўнік мае чатыры аддзелы: рубец, сетку, кніжку, сычуг. Парнакапытныя, якія паўторна не пережоўваюць корм і маюць аднакамерны страўнік, належаць да няжвачных.

**Пытанні і заданні.** **1.** Якіх жывёл называюць парнакапытнымі і няпарнакапытнымі? **2.** Як пабудаваны страўнік жвачных парнакапытных? Апішыце працэс апрацоўкі корму. **3.** Параўнайце тып кармлення дзіка і зубра. **4.** З прапанаванага спіса жывёл выберыце і назавіце спачатку парнакапытных, потым — няпарнакапытных: лось, зубр, зебра, насарог, дзік, конь, асёл, казуля.

**Біялагічныя рэкорды**

- Самае цяжкавагавае млекакормячае Беларусі — *зубр еўрапейскі*. Можа дасягаць масы 900 кг, вышыні ў карку — амаль што 2 м.
- Самая хуткая траваедная жывёла Беларусі — *казуля еўрапейская*. Развівае хуткасць да 80 км/г.

## § 57. Хобатныя і прыматы

**Успомніце:** **1.** Як адбываецца цеплаабмен у млекакормячых? **2.** Якія аддзелы мозга найбольш развітыя ў млекакормячых і чаму?

***Атрад Хобатныя.*** Яго прадстаўнікамі з'яўляюцца самыя буйныя наземныя млекакормячыя свету — сланы. У слана масіўная галава, цела падобнае на бочку, а канечнасці — на калоны. Вушныя ракавіны рухомыя, буйныя. Развітая густая сетка крывяносных сасудаў вушэй знаходзіцца блізка да паверхні скуры. Крывяносныя сасуды

Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»



**Мал. 197.** Слон саванны



**Мал. 198.** Слон азіяцкі

ўдзельнічаюць у вывядзенні залішняга цяпла з арганізма, таму жывёлы не пераграваюцца ў спякоту. У сланоў нос і верхняя губа відазменены ў хобат. Хобат жывёлы выкарыстоўваюць у розных мэтах: здабываюць корм, падымаюць цяжкія бярвёны, абліваюць сябе вадой або абсыпаюць пылам. Сланы — раслінаедныя жывёлы. Грубы раслінны корм яны пераціраюць добра развітымі карэннымі зубамі. Іклы адсутнічаюць. Біўні слана — гэта падоўжаныя разцы верхняй сківіцы (на ніжняй сківіцы разцоў няма). У самцоў біўні даўжэйшыя і таўсцейшыя, чым у самак.

Існуюць тры віды сланоў: *слон саванны*, *слон лясны*, *слон азіяцкі*. Саванны і лясны сланы насяляюць саванны і трапічныя лясы Афрыкі, азіяцкі слон сустракаецца ў Паўднёва-Усходняй Азіі.

*Слон саванны* (мал. 197) — самы буйны сярод суродзічаў. Скура яго афарбавана ў цёмна-шэры колер. Адрозніваецца жывёла велізарнымі вушамі з ярка выяўленым малюнкам вен і доўгімі выгнутымі біўнямі.

*Слон лясны* — самы дробны сярод суродзічаў. Цела яго пакрыта густым валасяным покрывам рудога колеру. З-за круглай формы вушэй жывёлу яшчэ называюць круглавухім сланом. Біўні ў слана ляснога прамыя і тонкія.

Афрыканскія сланы ўключаны ў Чырвоную кнігу Міжнароднага саюза аховы прыроды.

*Слон азіяцкі* (мал. 198) саступае па памерах саваннаму, але большы за ляснога. Целасклад масіўны. Скура тоўстая, маршчыністая, сухая. Афарбоўка бывае ад цёмна-шэрай да бурай. Біўні слана азіяцкага ў 2–3 разы карацейшыя, чым у саваннага, і развіваюцца толькі ў самцоў.

***Атрад Прыматы*** аб'ядноўвае найбольш высокаарганізаваных жывёл, якія насяляюць субтропікі і тропікі Азіі, Афрыкі і Амерыкі. Адны віды прыматаў большую частку жыцця праводзяць на каронах

Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»



Равун чорны Мандрыл Мартышка блакітная Шыраканосая малпа

**Мал. 199.** Прадстаўнікі прыматаў

дрэў, другія — на зямлі (мал. 199). Яны добра лазяць па дрэвах. Пярэднія канечнасці рухомыя, з доўгімі пальцамі. У большасці прыматаў вялікі палец рукі супрацьпастаўлены іншым, што дазваляе трывала абхапіць галінку пры лажанні. Многім прыматам перамяшчацца па дрэвах дапамагае доўгі ўчэпісты хвост, аднак існуюць караткахвостыя і бясхвостыя віды. Перамяшчаючыся па паверхні зямлі, прыматы абапіраюцца на ўсю ступню. Пальцы ў большасці відаў канчаюцца не кіпцюрамі, а пазногцямі — вытворнымі скуры.

Галаўны мозг у прыматаў буйны, кара вялікіх паўшар'яў мае мноства баразён і звілін. Таму ў жывёл складаныя паводзіны, а ўмоўныя рэфлексы выпрацоўваюцца хутчэй. У прыматаў добра развіты слых і зрок, а роля нюху зніжаецца. Вочы здольны бачыць прадметы паблізу і ўдалечыні. Органы дотыку знаходзяцца на падушачках пальцаў, далонях і падэшвах ступняў.

Прыматы жывуць або ў статку, або парамі, або па адным. Дзіцяня прыматаў нараджаецца відушчым, але бездапаможным і няздольным да самастойнага перамяшчэння. Часцей за ўсё дзіцяня моцна чапляецца за шэрсць маці, якая носіць яго з сабой, прытрымліваючы пярэдняй канечнасцю.

Прыматы ў асноўным кормяцца лісцем раслін, садавінай, могуць паядаць насякомых і іх лічынак.

Чалавек таксама належыць да атрада Прыматы. Найбольшае падабенства з чалавекам назіраецца ў чалавекападобных малпаў — *арангутанаў*, *шымпанзэ*, *гарыл* (мал. 200 на с. 220). У чалавекападобных малпаў, як у чалавека, развіты мімічныя мышцы, чатыры групы крыві, і хварэюць яны на падобныя інфекцыйныя захворванні. Зносіны паміж чалавекападобнымі малпамі адбываюцца з дапамогай гукаў і знакаў.

Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»


Шымпанзэ звычайны


Гарыла заходняя


Арангутан калімантанскі

**Мал. 200.** Чалавекападобныя малпы

**Паўторым галоўнае.** Да атрада Хобатныя належаць самыя буйныя наземныя млекакормячыя свету — сланы. Іх адметнымі рысамі з'яўляюцца вялікія вушныя ракавіны, шматфункцыянальны хобат, біўні. Прадстаўнікі атрада Прыматы — самыя высокаарганізаваныя жывёлы. У іх пяціпальцавыя канечнасці, вялікі палец супрацьпастаўлены іншым, замест кіпцюроў — пазногці. Развіта кара вялікіх паўшар'яў. Прыматы адрозніваюцца складанымі паводзінамі.

**Пытанні і заданні. 1.** Дзе жывуць сланы і чаму яны не насяляюць паўночныя рэгіёны планеты? **2.** Якое значэнне ў жыцці слана маюць вушы і хобат? **3.** Чаму прыматы з'яўляюцца высокаарганізаванымі жывёламі? **4.** Якія асаблівасці будовы дазваляюць прыматам спрытна перамяшчацца па дрэвах? **5.** Што агульнага ў чалавекападобных малпаў з чалавекам?

## § 58. Роля млекакормячых у прыродзе і значэнне ў жыцці чалавека. Сельскагаспадарчыя жывёлы

**Успомніце: 1.** Якую ролю ў прыродзе выконваюць рыбы, земнаводныя, паўзуны і птушкі? **2.** Якое значэнне ў жыцці чалавека маюць рыбы, земнаводныя, паўзуны і птушкі?

**Роля млекакормячых у прыродзе.** Як і ўсе жывыя арганізмы, млекакормячыя з'яўляюцца неад'емным звяном у ланцугах харчавання. Некаторыя раслінаедныя млекакормячыя могуць знішчыць значную колькасць раслін на тэрыторыі свайго пражывання. Часам яны здольны пераўтвараць ландшафты. Напрыклад, пабудаваныя бабрамі

Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»